## ЧЫТАЦЬ, КАБ СПАСЦІГНУЦЬ СВЕТ І СЯБЕ: ДА 500-ГОДДЗЯ БЕЛАРУСКАГА КНІГАДРУКАВАННЯ

**«Гэты беларус быў з тых, самых першых, што стварылі лепшых з нас такімі, якія мы ёсць. Ва ўзбраенні ведаў, усемагутнасці розуму, адкрытай шчырасці добрага сэрца. З навукай у адной руцэ і мастацтвам – у другой. З катаржнай працы такіх, як ён (а для ўсходніх славян – з яго) пачынаецца ўзлёт гуманізму, ідэі раўнапраўя (хай сабе спачатку ўтапічнай), рэнесанс мастацтва, літаратуры, навукі», – так адзін наш славуты суайчыннік Уладзімір Караткевіч азначыў гістарычную ролю другога славутага суайчынніка – Францыска Скарыны.**

**У выніку «катаржнай працы» беларускага першадрукара на самым пачатку яго самаахвярнай дзейнасці ў Празе за тры гады былі выпушчаны ў свет 23 кнігі. Дата выхаду першай з іх, «Псалтыра», – 6 жніўня 1517 года. Гэты дзень лічыцца пачаткам беларускага кнігадрукавання. Сёлета наша краіна ўрачыста адзначае яго 500-годдзе.**

**У беларускіх гарадах і гарадах, звязаных з жыццём і дзейнасцю Францыска Скарыны (Празе, Вільні і інш.), адбудуцца навуковыя, мастацкія, інфармацыйныя і асветніцкія мерапрыемствы, прысвечаныя знамянальнаму юбілею. Кульмінацыя святкавання прыпадзе на верасень, калі будзе адзначацца Дзень беларускага пісьменства.**

**500-годдзю беларускага кнігадрукавання прысвяцілі і мы жнівеньскі выпуск нашай «Педагагічнай асамблеі». У сваіх артыкулах аўтары даюць метадычныя парады па фарміраванні цікавасці да чытання, прапануюць распрацоўкі канкрэтных мерапрыемстваў, накіраваных на выхаванне чытацкай культуры.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Кніга ў інтэлектуальным і духоўным развіцці асобы

## Арганізацыйна-педагагічныя і дыдактычныя ўмовы далучэння дзяцей і падлеткаў да чытання



**Н. У. Клімянкова,**
прафесар кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**Кнігавыданне на тэрыторыі Беларусі мае даўнюю і слаўную гісторыю. Еўфрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Сімяон Полацкі – вялікія кніжнікі і асветнікі. Зоркай першай велічыні ў гэтым бессмяротным шэрагу зззяе імя Францыска Скарыны – першадрукара і вучонага, мастака і пісьменніка, перакладчыка Біблії на родную мову.**

**Сёлета мы адзначаем 500-годдзе з дня выхаду ў свет першай з выпушчаных ім кніг. «Псалтыр» – гэта выдатны ўзор кнігавыдавецкага, перакладчыцкага, выяўленчага мастацтва.**

**Хаця Скарына распачаў сваю друкарскую дзейнасць у Празе, кнігі яго прызначаліся для суайчыннікаў, сучасных яму беларусінаў, ліцвінаў – «людзей паспалітых». І з'явіліся гэтыя кнігі не выпадкова, а як адказ на духоўныя запатрабаванні землякоў першадрукара.**

## Прапаганда чытання – сацыяльна значная задача

Імклівае развіццё гарадоў на беларускіх землях у пачатку XVI стагоддзя спрыяла ўзнікненню ў свядомасці іх насельнікаў новых сацыяльна-маральных арыенціраў і каштоўнасцей. Усё большая значнасць надавалася індывідуальным вартасцям чалавека – кемлівасці, розуму, працавітасці, дасведчанасці, маральнасці. Узрастаў прэстыж ведаў і прафесійнага майстэрства. Заможныя гараджане пачалі праяўляць зацікаўленасць у развіцці навукі, асветы, кнігадрукавання. Менавіта ў такім асяроддзі і магла з'явіцца такая гістарычная асоба, як Францыск Скарына, які заўсёды памятаў аб месцы свайго нараджэння – слаўным горадзе Полацку. Дарэчы, друкарская дзейнасць Францыска Скарыны і ў Празе, і ў Вільні ажыццяўлялася пры фінансавай падтрымцы заможных гараджан-беларусаў. Як бачым, паважлівае стаўленне да кнігі ў нашым народзе мае глыбокія гістарычныя карані.

Тым больш крыўдная наяўнасць крызісных з'яў у адносінах да чытання з боку нашых малодшых суайчыннікаў. Чытанне як кагнітыўны працэс дэкадзіравання сімвалаў і знакаў, у выніку якога адбываецца разуменне напісанага тэксту, усё часцей саступае месца спажыванню гатовых выяў, прапануемых аўдыявізуальнымі каналамі. Гэта прыводзіць да таго, што многія прадстаўнікі маладога пакалення пачынаюць лічыць працэс непасрэднага ўзаемадзяння з тэкстам празмерна складаным і цяжкім.

Працэс чытання, акрамя элементарнай пісьменнасці, патрабуе ад нас наяўнасці пэўных ведаў, вопыту, культуры ўспрымання і разумення прачытанага, фантазіі, уважлівасці, сканцэнтраванасці. І што самая важнае – не толькі патрабуе, але і спрыяе інтэлектуальнаму і маральнаму ўдасканаленню, фарміруе здольнасць разумець і запамінаць прачытаную інфармацыю.

**Вылучаюць тры асноўныя тыпы чытання:**

- інфармацыйнае – успрымаецца толькі сэнс заключанай у тэксце інфармацыі;
- паглыбленае – накіравана не толькі на ўспрыманне і разуменне прачытанага, але і на запамінанне з падрабязным крытычным разборам і асэнсаваннем утрымліваемай у тэксце інфармацыі, пераўтварэннем яе ў веды;
- мастацкае – у выніку яго развіваецца ўяўленне, вобразнае мысленне, эмпатыя.

Кожны тып чытання нясе пэўную нагрузку, а ўсе яны спрыяюць інтэлектуальнаму і маральнаму развіццю асобы. Таму прапаганда чытання, асабліва ў маладзёжным асяродку, сёння з'яўляецца сацыяльна значнай задачай, на вырашэнне якой накіраваны намаганні педагогаў, псіхолагаў, пісьменнікаў, кнігавыдаўцоў, бібліятэкараў.

Сёння неабходны трансфармацыя бібліятэк і ўсёй сістэмы кнігараспаўсюджання і падтрымкі чытання з улікам змен, што адбываюцца ў сацыякультурнай галіне, пошук новых форм узаемадзеяння з патэнцыяльнымі чытачамі, глыбокае тэарэтычнае асэнсаванне асноўных кірункаў дзейнасці па далучэнні да чытання дзяцей і падлеткаў. Важна выявіць эфектыўныя механізмы педагагічнага ўплыву на інфармацыйныя паводзіны асобы з мэтай фарміравання яе інфармацыйнай культуры, заахвочвання да чытання, якое было і застаецца адным з найбольш дзейсных інструментаў пазнання.

Ствараючы адпаведнае інфармацыйнае асяроддзе, забяспечваючы доступ юным чытачам да сусветных інфармацыйных рэсурсаў, мы не можам пакінуць іх сам-насам з праблемамі пошуку, адбору і засваення інфармацыі, пераўтварэння яе ў веды. Сёння ўжо зусім недастаткова зрабіць інфармацыю ва ўсіх яе відах, формах, на ўсіх магчымых носьбітах фізічна даступнай маладому чалавеку. Неабходна аказваць яму ўсебаковую дапамогу па яе ўспрыманні, асэнсаванні і засваенні, а гэта ўжо – цэлы комплекс педагагічных задач. Не менш значнай падаецца і праблема фарміравання навыкаў самаабароны ад дэструктыўнага, непажаданага інфармацыйнага ўплыву.

Адным з ключавых складнікаў педагагічнай сістэмы, накіраванай на далучэнне дзяцей і падлеткаў да чытання, з'яўляецца вызначэнне, абгрунтаванне і праверка адпаведных педагагічных умоў. Бо менавіта ад іх залежыць паспяховасць і эфектыўнасць функцыянавання гэтай сістэмы. Педагагічныя ўмовы адлюстроўваюць сукупнасць магчымасцей знешняга і ўнутранага асяроддзя для аказання станоўчага ўплыву на асобасны і працэсуальны аспекты чытацкай дзейнасці, для забеспячэння яе эфектыўнага ажыццяўлення і ўдасканалення.

## Педагагічныя ўмовы далучэння да чытання

Настаўнікам, бібліятэказнаўцам, кнігазнаўцам мэтазгодна ажыццявіць класіфікацыю педагагічных

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

умоў у адпаведнасці з характарам і спецыфікай педагагічных праблем, уласцівых менавіта педагагічнай сістэме, накіраванай на далучэнне дзяцей і падлеткаў да чытання і педагагічнае забеспячэнне дадзенага працэсу.

**Арганізацыйна-педагагічныя ўмовы** ўяўляюць сабой, з аднаго боку, сукупнасць аб'ектыўных магчымасцей, неабходных для вырашэння педагагічных задач [5], а з другога – сукупнасць форм і метадаў, сродкаў і рэсурсаў, якія спрыяюць дасягненню педагагічных мэтаў [2].

Арганізацыйна-педагагічнымі ўмовамі далучэння да чытання выступаюць:

- узаемадзеянне бібліятэк, іншых сацыяльных інстытутаў (школа, сям'я), а таксама педагагічных сістэм падтрымкі чытання;
- наяўнасць інфармацыйных рэсурсаў, сфарміраваных і падрыхтаваных належным чынам для выкарыстання;
- даступнасць інфармацыйных рэсурсаў сусветнай інфармацыйнай прасторы;
- сістэмнасць мерапрыемстваў, накіраваных на прыцягненне да чытання;
- адпаведнасць матэрыяльна-тэхнічнай базы вырашаемым задачам;
- адзінства кіравання педагагічнымі і бібліятэчна-інфармацыйнымі працэсамі.

Прыкладам супрацоўніцтва розных сацыяльных інстытутаў можна назваць арганізацыю мінскага кніжнага фестывалю «Горад і кнігі», падчас якога ўсе зацікаўленыя асобы, а таксама арганізацыі ажыццяўляюць сувязь праз сацыяльныя сеткі, платформу Talaka.by, сродкі масавай інфармацыі. Так, сёлета адбыўся ўжо трэці кніжны фестываль (на базе бібліятэкі БНТУ). У яго падрыхтоўцы і правядзенні аб'ядналі свае намаганні педагогі, бацькі, пісьменнікі, кнігавыдаўцы, гандляры, бібліятэкары. Падчас фестывалю можна было не толькі набыць цікавую кніжку, але і паслухаць лекцыю, сустрэцца з пісьменнікамі, паглядзець «старадаўнія» дыяфільмы, стварыць уласнаручна ілюстрацыю да кнігі або ляльку – выяву любімага героя, прыняць актыўны ўдзел у абмеркаванні кніг, дыскусіі, конкурсе, інтэлектуальнай гульні.

**Псіхолага-педагагічныя ўмовы** забеспячэння падтрымкі чытання адлюстроўваюць асобасны аспект педагагічнай і бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці. З улікам спецыфічных характарыстык чытання як пазнавальна-камунікатыўнага працэсу дадзеныя ўмовы прадугледжваюць:

- вывучэнне спецыфікі чытання, інтэлектуальных і псіхалагічных характарыстык чытача;
- падрыхтоўку педагога, бібліятэкара, іншых спецыялістаў як суб'ектаў педагагічнай дзейнасці: фарміраванне ў іх здольнасцей мэтанакіравана і адрасна выкарыстоўваць інфармацыйны патэнцыял грамадства;
- аптымізацыю чытацкай дзейнасці дзяцей і падлеткаў, фарміраванне чытацкіх інтарэсаў;
- мэтанакіраваны ўплыў на змест і характар унутранага асяроддзя устаноў адукацыі, бібліятэк, іншых сацыяльных інстытутаў, зацікаўленых у падтрымцы чытання;
- аналіз асаблівасцей знешняга асяроддзя і ўстанаўленне ўзаемадзеяння з ім.

У няпростай справе псіхолага-педагагічнай падтрымкі чытання вельмі многае залежыць ад камунікатыўнай, прафесійнай і чытацкай кампетэнтнасці спецыяліста, які яе ажыццяўляе. Гэта павінна быць педагогіка супрацоўніцтва, раўнапраўных суб'ект-суб'ектных зносін, якая не толькі забяспечвае свабодны доступ да інфармацыі і культурных каштоўнасцей, але і актыўна ўплывае на змест і характар чытання, садзейнічае фарміраванню інфармацыйнай і чытацкай культуры. Кіраўнік чытання, хто б ён ні быў, павінен выступаць у ролі не ментара, кантралёра, а трэнера, дарадчыка. І, зразумела, ён сам павінен быць заўзятым чытачом.

Аптымізацыі чытацкай дзейнасці, фарміраванню цікавасці да чытання ў значнай ступені спрыяе актыўнасць саміх дзяцей і падлеткаў падчас засваення літаратурнага тэксту. Фактарамі, стымулюючымі яе, могуць стаць наяўнасць таварыскіх зносін, тэатралізацыя, падрыхтоўка ілюстрацый, прэзентацый па любімых творах, літаратурныя гульні, конкурсы, спаборніцтвы і інш. Пачынаць можна з ужо распрацаваных спецыялістамі гульняў на падставе літаратурных твораў, але найбольшы ўплыў на развіццё юных чытачоў робіць самастойнае стварэнне імі гульні па матывах прачытаных кніжак. Перспектыва падрыхтоўкі сцэнарыя, віктарыны, конкурсу захочваюць хлопчыкаў і дзяўчынак да больш уважлівага чытання, да глыбокага пранікнення ў змест і сэнс пэўнага твора.

Вялікі педагагічны патэнцыял мае арганізацыя актыўных чытацкіх зносін. Клубы аматараў кнігі, дыскусійныя суполкі, літаратурныя аб'яднанні, дзе адбываецца калектыўнае абмеркаванне прачытанага, стымулююць удумлівае стаўленне да кнігі, даюць магчымасць выказваць свае думкі, адстойваць свой пункт гледжання, аргументаваць сваё бачанне таго або іншага твора.

У структуры ўнутранага бібліятэчнага асяроддзя можна вылучыць матэрыяльна-тэхнічныя, эмацыянальна-эстэтычныя, інфармацыйна-метадычныя і сацыяльна-псіхалагічныя кампаненты. Кожны паасобку і ўзятыя разам, яны ствараюць непаўторную атмасферу, здольную заахвоціць дзяцей і падлеткаў да чытання, забяспечыць ім камфортны і бесперашкодны доступ да кнігі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Дыдактычныя ўмовы** далучэння дзяцей і падлеткаў да чытання ўяўляюць сабой сукупнасць форм, метадаў, прыёмаў, накіраваных на забеспячэнне плённай чытацкай дзейнасці па пошуку, выбары і засваенні інфармацыі, пераўтварэнні яе ў веды.

Прыярытэтнымі кірункамі бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання, якія патрабуюць спецыфічных дыдактычных умоў, з'яўляюцца:

- ❑ фарміраванне прававой культуры карыстальнікаў;
- ❑ дапамога ў бесперапыннай адукацыі і самаадукацыі;
- ❑ дапамога сацыяльна неабароненым карыстальнікам;
- ❑ фарміраванне культуры чытання і інфармацыйнай культуры.

Спецыфічна бібліятэчнымі формамі стварэння і рэалізацыі дыдактычных умоў далучэння да чытання з'яўляюцца кніжныя выставы, бібліятэчныя дыялогі, кансультацыі, гутаркі, агляды літаратуры, праграмы і планы чытання, усе віды даведак, квесты, конкурсы, віктарыны, урокі інфармацыйнай культуры, чытацкія аб'яднанні і клубы па інтарэсах, групавыя і масавыя мерапрыемствы і г.д.

Школьныя і раённыя дзіцячыя бібліятэкі імкнуцца шырока выкарыстоўваць прыём «знайшоў цікавую кніжку – парай іншаму». Плённы і метад «блакітнага чамаданчыка», які прыйшоў да нас з Германіі. Сутнасць яго заключаецца у тым, што юным чытачам прапануецца некалькі кніг для чытання і абмеркавання. Але ў такі «чамаданчык» уваходзяць не толькі кнігі. Тут утрымліваюцца таксама квесты, віктарыны, крыжаванкі, пытанні, іншыя заданні, якія можна выканаць, толькі прачытаўшы прапанаваныя творы. Па выніках такой чытацкай работы праводзіцца конкурс. Расійскія бібліятэкары пераўтварылі «чамаданчык» у «кніжны рукзачок», але сутнасць засталася нязменнай: далучэнне да актыўнага, удумлівага чытання. У інтэрнэце можна знайсці спісы кніг, якія суправаждае пытанне: «А колькі з іх ты прачытаў?». Сучасныя бібліятэкі таксама бяруць на ўзбраенне гэты прыём, і ён дзейнічае.

Выніковасць кожнай з азначаных форм узаемадзеяння з юнымі чытачамі знаходзіцца ў непасрэднай залежнасці ад наступных дыдактычных умоў:

- ❑ псіхолага-педагагічнага майстэрства бібліятэкара;
- ❑ адпаведнасці зместу інфармацыі інтарэсам чытачоў;
- ❑ сэнсавай даступнасці інфармацыі;
- ❑ нагляднасці;
- ❑ наяўнасці інтэрактыўных элементаў;
- ❑ актыўнасці і зацікаўленасці саміх чытачоў.

**Рэзюмэ аўтара**

**Ствараючы арганізацыйна-педагагічныя, псіхолага-педагагічныя і дыдактычныя ўмовы далучэння да чытання дзяцей і падлеткаў, важна ўлічваць унутраныя асаблівасці адпаведнай установы, спецыфіку псіхолага-педагагічных працэсаў, што адбываюцца пры ўзаемадзеянні з юным чытачом. І настаўнікі, і бібліятэкары добра ведаюць, што сёння зусім недастаткова сабраць навучэнцаў у адным месцы і прапанаваць ім «нешта паслухаць, убачыць» і г. д. Трэба дэталёва прадумаць спосабы актыўнага ўзаемадзеяння. Толькі ў гэтым выпадку юныя чытачы застануцца задаволенымі мерапрыемствам і зробяць адпаведныя педагагічна спрагназаваныя вывады.**

## ЛІТАРАТУРА


1. **Авгуль, Л. А.** О жизненных ценностях и чтении учащейся молодежи / Л. А. Авгуль // Современные проблемы книжной культуры: основные тенденции и перспективы развития: материалы V Международного научного семинара (Минск, 19 – 20 апреля 2016 г.). – Минск: ЦНБ НАН РБ; Москва: «Наука» РАН, 2016. – С. 7–10.
2. **Беликов, В. А.** Философия образования личности: деятельностный аспект: монография / В. А. Беликов. – М.: Владос, 2004. – 357 с.
3. **Вовк, О.** «Город и книги»: первый Минский книжный фестиваль / О. Вовк // Інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі ў бібліятэках / склад.: Л. І. Макаранка, В. А. Тамашова. – Мінск: Красіка-Прынт, 2015. – С. 4–9.
4. **Ипполитова, Н.** Анализ понятия «педагогические условия»: сущность, классификация / Н. Ипполитова, Н. Стерхова // General and Professional Education. – 2012. – № 1. – С. 8–14.
5. **Козырева, Е. И.** Школа педагога-исследователя как условие развития педагогической культуры / Е. И. Козырева // Методология и методика естественных наук: сб. науч. трудов. – Вып. 4. – Омск: Изд-во ОмГПУ, 1999. – С. 4–9.
6. **Павлов, С. Н.** Организационно-педагогические условия формирования общественного мнения органами местного самоуправления: автореф. дис. ... канд. пед. наук / С. Н. Павлов. – Магнитогорск, 1999. – 23 с.
7. **Современное состояние и тенденции развития детского чтения в Республике Беларусь:** по результатам республиканского исследования / Национальная библиотека Республики Беларусь; сост.: М. Г. Пшибытко, О. В. Гаврилович. – Минск: НББ, 2011. – 155 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ